

ЧЫМ ЖЫВЕ ПРЫГАЖУНЯ Ў ФОРМЕ

ЧЫРВОНКА

КУПАЛЫ НАД БЯРЭЗІНАЙ 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 ЖНІЎНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 163 (30297)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вераніка ГУДКОВА, сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ:**

*«Маладзёжныя экіпажы намалацілі больш як 865 тысяч тон збожжа і зернебабовых. У той жа час маладыя вадзіцелі перавезлі больш як 413 тысяч тон. Гомельская вобласць па-ранейшаму займае першае месца па колькасці намалочаных тон — 393 тысячы, у той жа час лідарам па перавезеным маладымі кіроўцамі збожжы і зернебабовых стала Мінская вобласць — больш за 145 тысяч тон. Колькасць тысячнікаў сярод маладзёжных экіпажаў дасягнула 200, а сярод маладых вадзіцеляў такіх ужо 163».*

# Птушкі — справа сур'ёзная



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Аператар птушкафабрык і механізаваных ферм ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» Тамара УЛАСЕНКА амаль трыццаць гадоў працуе ў роднай гаспадарцы. Удзельніца II Рэспубліканскага форуму працаўніц вёскі, яна адзначана Ганаровай граматай Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта і ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Гомельскага райвыканкама. Неаднаразова за дасягненне высокіх паказчыкаў у сельскагаспадарчай вытворчасці была занесена на Дошку гонару Гомельскага раёна. За працоўныя поспехі ў 2023 годзе працаўніца ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» узнагароджана нагрудным знакам Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання «За заслугі ў сельскай гаспадарцы».**

## КОРАТКА

• Дэфіцыт бюджэту Беларусі ў 2025 годзе чакаецца на ўзроўні Br4,5 млрд.

**• За студзень — ліпень 2024 года сукупны аб'ём біржавых здзелак, праведзеных прадпрыемствамі Кіраўніцтва справаў Прэзідэнта, склаў Br128,4 млн, што на 71 працэнт больш за аналагічны перыяд мінулага года.**

• У Беларусі матэрыяльную дапамогу на падрыхтоўку дзяцей да школы атрымалі ўжо больш як 101 тыс. шматдзетных сем'яў на 201 тыс. дзяцей.

**• Больш за 1,3 млн тон сталі выраблена на БМЗ па выніках сямі месяцаў гэтага года.**

• За апошнія пяць гадоў у Беларусі нарасцілі аб'ёмы вытворчасці рапсавага алею ў 1,4 раза — з каля 417 тыс. т у 2019 годзе да 578 тыс. т у 2023 годзе.

Напярэдадні

# Найлепшы сябар школьніка

Да першага верасня ў школах з'явяцца тры новыя навучальныя дапаможнікі



Фота Лізаветы ГОПАД.

**Ранцы вучняў пацяжэюць — другакласнікі дададуць у іх дапаможнік па асновах бяспекі жыццядзейнасці. Асновы дапрызыўнай і медыцынскай падрыхтоўкі будуць вывучаць навучэнцы дзявятых класаў, кадэцкіх вучылішчаў, спецыялізаваных ліцэяў і Суворўскага вучылішча. Найцікавейшая, на думку складальнікаў, выдаўцоў, спецыялістаў Міндукацыі і настаўнікаў, «Гісторыя Беларусі ў кантэксце Сусветнай гісторыі» падрыхтавана для дзесяцікласнікаў.** СТАР. 5

Сезонны клопат

# РЫХТУЙ ДАРОГІ ЛЕТАМ...

## У дарожнікаў — зімовыя турботы

**Падрыхтоўка рэспубліканскіх аўтамабільных дарог і вулічна-дарожнай сеткі Мінска да зімы вядзецца на працягу ўсяго лета, а цяпер гэтыя работы ўвайшлі ў найбольш актыўную фазу. Устараняецца калейнасць, праводзіцца ямачны рамонт, вядзецца ахоўная апрацоўка дарожнага пакрыцця, а таксама рамантуюцца машыны і абсталяванне, нарыхтоўваюцца пясчана-саляная сумесь і тэхнічная соль.** СТАР. 6



ISSN 1990 — 763X

24163>

9 771990 763008